# НА МОВЕ ПРА СКІДЗЕЛЬ АД «А» ДА «Я»

У Скідзельскай СШ № 3 вучні ведаюць, любяць і шануюць нашу беларускую мову. Да такой прыемнай высновы я прыйшла, правёўшы сустрэчу ў фармаце круглага стала са старшакласнікамі гэтай навучальнай установы. Мерапрыемства адбылося ў рамках тыдня беларускай мовы і філалогіі з нагоды святкавання Міжнароднага дня роднай мовы.




Тэма нашай беларускамоўнай дыскусіі была «Скідзель ад «А» да «Я»», падчас якой вучні падтрымалі маю ініцыятыву стварыць у сааўтарстве друкаваны падарожнік для дзяцей пад такой назвай у гуртках «Журналёнак» і «Чарадзеі слоў».

Безумоўна, вялікая заслуга ў поспеху дадзенага мерапрыемства належыць выкладчыцы беларускай мовы і літаратуры Ірыне Антонаўне Кошчыц, якая традыцыйна арганізуе сустрэчы вучняў з беларускімі паэтамі і празаікамі.

**Тамара МАЗУР,**
**член Саюза пісьменнікаў Беларусі**

**На фота:** у рамках тыдня беларускай мовы і філалогіі Міжнародны дзень роднай мовы адзначылі ў СШ № 3 г. Скідзеля дыскусіяй на тэму «Скідзель ад «А» да «Я»». Люты 2023 года.



